УДК 271-055.2(476.5)“1921/1939”

# ДЗЕЙНАСЦЬ СУПОЛЬНАСЦІ СЯСЦЁР СВЯТОЙ СЯМ'І З НАЗАРЭТУ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 гг.

**Аўсейчык Юлія Аляксандраўна**
Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік
(г. Полацк, Беларусь)

*У артыкуле разгледжана развіццё супольнасці сясцёр назарэтанак на заходнебеларускіх землях у міжваенны перыяд. Прасочана гісторыя супольнасці, вылучаны і ахарактарызаваны асноўныя накірункі дзейнасці.*

Супольнасць Сясцёр Святой Сям'і з Назарэта – гэта жаночая рымска-каталіцкая манаская кангрэгацыя, якая паўстала ў другой пал. XIX ст. на польскіх землях. Заснавальніцай супольнасці была Марыя Францішка Сядлюкая. У 1873 г. у Рыме папа Пій IX благаславіў “Benedіоat vos Deus et illum inet semper intelligentias vestras, ut possitis ambuiare in viis Dominп;. Die 1 Octobris 7873. Pius PP. IX” [7, s. 34] l адобрыў заснаванне новага манаскага інстытута пад назвай “Манаская супольнасць сясцёр Ларэтанак” (першапачатковая назва супольнасці).

Кангрэгацыя мала адрознівалася ад іншых жаночых манаскіх каталіцкіх супольнасцей, якія працавалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Згодна з канстытуцыяй, назарэтанкі павінны былі складаць тры зарокі: цнатлівасці, беднасці і паслухмянства. Асобы, якія збіраліся ўступіць у кангрэгацыю, павінны былі адбыць навіцыят, працягласцю два гады, якому папярэднічаў шасцімесячны пастулат. Пасля навіцыята сёстры прымалі часовыя абяцанні беднасці, цнатлівасці і паслухмянасці. Іх адзенне складалася з чорнай тунікі, накідкі таго ж колеру, якая свабодна апускалася да пояса, І белага вэлюму, які закрываў галаву І спіну [7, s.20]. Назарэтанкі павінны былі займацца катэхізацыяй сярод іўдзейскага, праваслаўнага і пратэстантскага насельніцтва (у асноўным сярод жаночага насельніцтва), а таксама падрыхтоўкай да прыняцця сакрамантаў [7, s. 14].

Дзейнасць сясцёр назарэтанак на заходнебеларускіх землях пачалася яшчэ ў пачатку XX ст. Яны прыбылі ў Гродна ў 1908 г. Дзякуючы намаганням архіепіскапу Віленскай архідыяцэзіі Эдварду Ропу, сёстрам ва ўладанне быў перададзены будынак манастыра брыгітак.

Яшчэ ў 1915 г. у Гродне сёстры назарэтанкі, выкарыстаўшы сітуацыю, што горад знаходзіўся ў нямецкай акупацыі, адкрылі гімназію. У ёй навучалюя ў розныя гады ад 150 да 500 чалавек. З уваходжаннем заходнебеларускіх зямель у склад ІІ Рэчы Паспалітай назарэтанкі замест гімназіі адкрылі на тэрыторыі манастыра агульнаадукацыйную базавую школу, якая атрымала статус дзяржаўнай у 1938 г. У гімназіі, а потым у школе выкладалі як духоўныя асобы, так І свецкія. Гэта школа функцыянавала да 1939 г. [6]. У 1937/1938 навучальным годзе, паводле падлікаў Л. Міхайлік, у школе навучалася 168 хлопчыкаў і дзяўчынак. Школа рэгулярна атрымлівала датацыі ад магістрата Гродна. Так, у бюджэце горада на 1938–1939 гг. для яе была прадугледжана сума ў памеры 1500 злотых [2, с. 452].

Як вынікае з крыніц, у 1922–1923 гг. кангрэгацыя ў Гродне налічвала 16 сясцёр, у 1923–1924 гг. – 18 , 1923–1924 гг. – 22 [8, s. 70]. Т. Гурская адзначае, што ў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

1920–1939 гг. з навіцыята гродненскага кляштара выехалі 83 сёстры назарэтанкі для апостальскай працы ў ЗША [6].

Акрамя агульнаадукайцыйнай дзейнасці супольнасць сясцёр назарэтанак, заснавала ў Гродне ткацкую майстэрню. Вядома, што вучаніцы займалюя там ткацтвам, рукадзеллем і вырабам трыкатажа. На чале майстэрні стаяла с. Натанаэла Кіткевіч, якая скончыла Кракаўскую школу дэкаратыўнага мастацтва і мастацкіх рамёстваў. Майстэрня дзейнічала да 1942 г. [1, с. 324-325].

Пра характар разгорнутай дабрачыннай дзейнасці кангрэгацыі ў сваёй працы ўзгадвае Л. Міхайлік наступнае: “Сёстры Назаратанкі займалюя дабрачыннасцю ў Гродне ў невялікай ступені. Яны апекавалюя некалькімі састарэлымі жанчынамі ў сваім кляштары і штодзённа выдавалі пры кляштарнай браме каля 30 абедаў для бедных” [3, с. 362].

Яшчэ ў 1910 г. сёстрам быў аддадзены фальварак у Каханаве (Гродзенскі павет, гміна Верцілішкі). Там супольнасць праводзіла заняткі па катэхізісу, а таксама законніцы даглядалі хворых. Святыня ў Каханаве толькі ў 1927 г. з’явілася ў католікаў (шляхам рэвендыкцыі) і была асвечана ксяндзом дэканам Баляславам Сперскім [6]. Каханаў быў у міжваенны перыяд месцам адпачынку для дзяцей і падлеткаў назарэтанскіх школ, сясцёр і гасцей.

У 1929 г. па запрашэнню бюкупа Сыгізмунда Лазінскага, які на той час узначальваў Пінскую дыяцэзію, сёстры назарэтанкі прыбылі ў Навагрудак. Менавіта бюкуп С. Лазінскій аддаў пад апеку кангрэгацыі – Фару (касцёл Божага Перамянення), якая стала цэнтрам адраджэння рэлігійнага жыцця каталіцкага насельніцтва Навагрудка [4, с. 7].

Мясцовыя жыхары, нягледзячы на нацыянальныя і рэлігійныя адрозненні ў дадзены міжваенны перыяд, суіснавалі талерантна. Як сведчыць М. Стажынская “першымі, хто аказаў дапамогу сёстрам з жыллём былі беларусы” [4, с. 7].

Напачатку сёстры назарэтанкі адкрылі інтэрнат [4, с. 8], які размясціўся ў іх доме, самым вялікім пакоі, і мог змяшчаць толькі 4 ложкі [4, с. 34]. З часам, мясцовае насельніцтва звыклася з прысутніцтвам законніц у горадзе. Дыскусіравалі мясцовыя жыхары толькі з той прычыны, чым павінны займацца сёстры назарэтанкі. Але праблему дапамог вырашыць бюкуп С. Лазінскі, які адказаў: “Школа павінна быць” [4, с. 36].

Ужо 2 верасня 1930 г. адчыніла свае дзверы пачатковая школа [4, с. 8]. Наплыў дзяцей быў такі вялікі, што праз два гады стала неабходнасць узвядзення новага будынку школы [4, с. 36]. У сярэдзіне 1933 г. пачатковая школа з дапамогай мясцовых жыхароў была перароблена [4, с. 8]. Двухпавярховы будынак быў узведзены, дзякуючы намаганням законніц і графа Яна Юндзіла-Балінскага [4, с. 36].

Згодна з архіўнымі дадзенымі, у 1936 г. у Навагрудку 17 сясцёр назарэтанак сваімі ўласнымі сіламі трымалі 6 класаў пачатковай школы, якая прыраўнівалася да дзяржаўных, справа была цалкам дабрачыннай. Пры школе сёстры трымалі пансіянат для вучаніц, якія паходзілі з ваколіц Навагрудка. Законніцам належала 4 га зямлі [5, s. 491].

У 1929 г. сёстры назарэтанкі арганізавалі курсы рукадзелля, дзе сярод вучаніц аказалюя дзяўчаты рознага веравызнання [4, с. 11]. Праводзілі назарэтанкі таксама ўрокі рэлігіі і французскай мовы [4, с. 33]. Манахіні даглядалі хворых на даму і ў шпіталях, дапамагалі шматлікім просьбітам.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

На момант 1939 г. у Навагрудку ў кляштары пражывала 11 сясцёр назарэтанак. Для законніц вайна пачалася 17 верасня 1939 г., калі ў іх спачатку адабралі будынак школы, а пасля і іх дом з гаспадарчымі пабудовамі.

Такім чынам, дзейнасць супольнасці сясцёр назарэтанак на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд была тэрытарыяльна звязана з Гродна і Навагрудкам. Галоўнымі задачамі супольнасць ставіла адукацыйна-выхаваўчую, душпастырскую і дабрачынную справы. Арганізацыя і ўтрыманне гімназіі ў Гродне і пачатковай школы ў Навагрудку сталі важным укладам ў пашырэнні адукацыйнай прасторы на заходнебеларускіх землях.

## Літаратура


1. Маліноўская, Т.Р. "Гродзенскі брыгітскі кляштар і назарэтанкі (1790-я – 1930-я гг.) / Т.Р. Маліноўская, Н.А. Маліноўская-Франке // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : X 12 зб. навук. арт. : у 2 ч. Ч. 2 / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: Э.С. Ярмусік [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2009. – С. 320–326.

2. Міхайлік Л. Каталіцкі Касцёл у грамадскім і палітычным жыцці Гродна ў 1921–1939 гг. / Л. Міхайлік // Гарадзенскі палімпсест. Асоба, грамадства, дзяржава. XV–XX стст. // пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. – Мінск : Зміцер Колас, 2011. – С. 444–462.

3. Міхайлік Л. Праблема сацыяльнага забеспячэння ў Гродне ў 1921–1939 гг. / Л. Міхайлік // Гарадзенскі палімпсест. Асоба, грамадства, дзяржава. XV–XX стст. // пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. – Мінск : Зміцер Колас, 2012. – С. 341–368.

4. Стажиньская, М. Одиннадцать мучениц /М. Стажиньская (перевод с польского: Лариса Михайлик). – Гродно: Гроднен. Рим.-Катол. Епархия, 1999. – 74 с.

5. Arcblwum Akt Nowych w Warszawe. Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświaty Publioznej. Zakony – sprawy ogólne – wykazy zakonów i informacje o działalności nadsyłane przez urzędy wojewódzkie 1922-1938. Sygnatura 906.

6. Górska, T. 100 lat Sióstr Nazaretanek / T. Górska – [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.niedziela.pl/artykul/1561/100-lat-Siostr-Nazaretanek-w-Grodnie. – Дата доступа: 01.10.2021.

7. J-ńczyk, X.H. Sługa Boża Marja-Franciszka Siedliska założycielka Zgromadzenia Zakonnego Sióstr Najświętszej Rodziny z Nazaretu (Nazaretanek) / X.H. J-ńczyk. – Łomża, Czcionkam i Drukarni Diecezjalnej, 1926. – s. 70.

8. Zgromadzenie Najświętszej Rodziny z Nazaretu. Pierwsze pięćdziesięciolegie jego istnienia 1875-1925. – Rzym, Drukarnia Watykańska, 1925. – 81 s.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова